

# Урок 101

Адкажы на пытанні. Растлумач вылічэнні.

Як атрымалі першы няпоўны здабытак?
Другі няпоўны здабытак?
Чаму роўны здабытак лікаў 185 і 45?




**1.** Вылічы ў слупок.

| | | |
|---|---|---|
| 175 · 35 | 692 · 24 | 44 · 396 |
| 329 · 17 | 518 · 13 | 25 · 434 |
| 486 · 53 | 679 · 18 | 39 · 374 |

**2.** Знайдзі значэнне выразу.
983 · 16 + 62 080 · 9 : 5

**3.** Вылічы вусна.

| | | |
|---|---|---|
| 15 030 : 3 | 7208 : 8 | 540 036 : 6 |
| 56 049 : 7 | 3604 : 4 | 540 036 : 9 |

**4.** Рашы ўраўненні.
$y : 5 = 439$  $a \cdot 6 = 25\,614$  $7 \cdot n = 977\,697$

**5.** Параўнай.

| | | |
|---|---|---|
| $\frac{1}{4}$ м ? 20 см | $\frac{1}{5}$ км ? 250 м | $\frac{1}{10}$ т ? 10 кг |
| $\frac{1}{5}$ дм ? 80 см | $\frac{1}{4}$ км ? 400 см | $\frac{1}{2}$ ц ? 600 кг |

**6.** Запішы ў выглядзе няроўнасці. Падбяры па тры значэнні зменных, пры якіх няроўнасці будуць правільныя.

- $a$ большае, чым здабытак лікаў 3 і 10 027.
- $b$ меншае, чым дзель лікаў 96 036 і 6.
- Лік 1263 меншы, чым рознасць лікаў 1270 і $c$.



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** У гадавальніку вырасцілі 7200 саджанцаў яблынь. У панядзелак прадалі $\frac{1}{9}$ частку саджанцаў, а ў аўторак — чвэрць саджанцаў, якія засталіся. У які дзень прадалі саджанцаў больш? На колькі саджанцаў больш?

**8.** Дзяніс і Павел адначасова паехалі на ролікавых каньках у супрацьлеглых напрамках. Праз 5 мін адлегласць паміж імі стала 1 км 900 м. З якой скорасцю ехаў Дзяніс, калі скорасць Паўла была 180 м/мін?

**9.** Выберы пару значэнняў скарасцей Дзяніса і Паўла, рухаючыся з якімі яны аддаляцца на такую ж адлегласць і за той жа час, як у задачы 8.
- Дзяніс: 170 м/мін, 190 м/мін, 220 м/мін.
- Павел: 190 м/мін, 250 м/мін, 210 м/мін.

Складзі задачу з выбранымі данымі.

**?** Дапоўні сказы.
«Пры множанні ў слупок ліку 237 на лік 64 спачатку ..., а потым ... . Атрыманыя ... здабыткі ...».

**1.** Вылічы ў слупок.
92 · 67 369 · 45 165 · 57 74 · 186

**2.** У акварыум змяшчаецца 15 васьмілітровых вёдзер вады або 12 аднолькавых каністраў вады. Якая ўмяшчальнасць адной каністры?



Правообладатель Национальный институт образования